анонс

# Сустрэцца ў Міры

У Музеі «Замкавы комплекс «Мір» у гарадскім пасёлку Мір Карэліцкага раёна 24 ліпеня пройдуць III «Кніжныя сустрэчы ў Мірскім замку». Сярод заснавальнікаў фэсту выдаўцоў і пісьменнікаў — «Замкавы комплекс «Мір», Выдавецкі дом «Звязда», Культурны праект *Art libtrum* ТАА «Навуковы свет», Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь. Па традыцыі падтрымку, спрыянне ў правядзенні «Кніжных сустрэч...» акажуць Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

У праграме кніжнага свята — выстаўкі экслібрыса і кніжнай графікі, прэзентацыі новых гісторыка-асветніцкіх, мастацкіх, краязнаўчых кніг, іншыя імпрэзы. Выдавецкі дом «Звязда» правядзе круглы стол, прысвечаны літаратурнаму краязнаўству ў Беларусі.

На III «Кніжных сустрэчах у Мірскім замку» чакаюць, несумненна, і зацікаўленых чытачоў, усіх тых, хто любіць і шануе кнігу!

**Мікола СЭРВАЧ**